# САКРЭТ ШАМБАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Шчаслівыя разам.

А потым была шчаслівая сустрэча на чыгуначным вакзале ў Мінску, спроба наладзіць быт у беларускай сталіцы і нарэшце эпахальнае рашэнне: трэба ехаць у вёску. Чаму не ў Маскву?

— Там мы адны з тысячы, а ў Хоцімскім раёне — нас усе ведаюць, — смяецца Алена.

Мы сядзім на іх утульнай кухні ў Горні, ядзім смачныя блінцы, п'ём духмяную гарбату і любуемся лесам з акна.

— Бачыце, як у нас прыгожа, — кажа Алена. — А ў Маскве нічога цікавага няма. Там людзі проста ходзяць на работу. А тут і дом, і агароджа, і гаспадарка — трэба ўсюды паспець. І я не шкадую. Мяне нудзіць ад маскоўскіх крамаў. А ад гэтых мясцін я яшчэ школьніцай была ў захапленні — сосны, лес на ўсе чатыры бакі. Я ўсё ўзважыла, супаставіла і зразумела, што нічога цікавага мяне ў Маскве не чакае. Зразумела, што хачу іншага...

— Раптоўна Андрэй стаў мне сніцца, — расказвае гісторыю свайго прасвятлення Алена. — А потым я даведалася, што ў гэты момант ён чытаў мае лісты, тыя, што я пісала яму з Масквы пасля нашага шчаслівага лета. Ён перавозіў маці ў суседнія Бяседавічы і знайшоў скрыню з імі. Гэтыя сны прымусілі мяне дзейнічаць. Я была тоўстая, зрок дрэнны — ну як такой ехаць да Андрэя? Ён жа маладзейшы за мяне, у дзяўчат попытам карыстаецца. Пахудзела на 20 кілаграмаў, зрабіла карэкцыю зроку і паехала. Мая маці была ў шоку, калі я памяняла Маскву на Беларусь, ды яшчэ на вёску. Але калі пабывала ў нас у гасцях, ёй усё спадабалася.

## Вясковае жыццё

Гэта цяпер іх дом — поўная чаша. А пачыналі ўсё са старой хаты, дзе прайшло дзяцінства Андрэя. Дзе ўзялі грошы на рамонт? Купілі парасят, вырасцілі і паехалі прадаваць у Маскву. Тут былыя сувязі і спатрэбіліся. Тавар прадалі ўдала. У маці Алены ў Маскве офіс ад адной з касметычных кампаній. Дачка адкрыла філіял у Хоцімску. Гэта быў той бізнес, у якім яна на той момант была ўпэўнена. А заадно вывучала попыт. Людзі скардзіліся на недахоп гаспадарчых рэчаў. У наступны ваяж у Маскву на грошы, атрыманыя ад продажу свініны, сужэнцы купілі тыя самыя запатрабаваныя ў насельніцтва гаспадарчыя рэчы. І справа пайшла. Зараз усе ведаюць у Хоцімску краму сужэнцаў Шамбаў, яна так і называецца «Тысяча дробязяў».

— Мы працавалі з самага пачатку на рэпутацыю, — кажа Алена. — Ніякага павышанага тону, добразычлівая усмешка, максімум ветлівасці — інакш чалавек да цябе не пойдзе. Ад Горні да Хоцімска больш за 10 кіламетраў, а машыны тады ў нас яшчэ не было. І я купіла ровар. А праз некаторы час знайшліся сродкі і на аўто.

Алена шчыра кажа, што грошы на вёсцы нялёгкія. «Я і роды ў свіней прымала. Дагэтуль успамінаю з жахам, — прызнаецца яна. — А аднойчы прывезлі парасят у Расію, адкрылі багажнік, а народ як пачаў іх хапаць. Думалі, застанёмся і без грошай, і без парасят. Аказалася, што гэта перакупшчыкі. Потым быкамі займаліся. Ездзілі па іх ажно ў Брэст. Вырасцілі і таксама прадалі на мяса. Сама тушы разбірала, а што рабіць? І гусей абскубала. Зараз вось птушкагадоўляй заняліся. Інкубатары купілі. У вёсцы шмат на чым можна грошы атрымаць. Шмат ідэй, але сіл не хапае. Мы ж яшчэ венікі прадаём і травы — я іх сама збіраю. У вятроўніку, напрыклад, саліцылавая кіслата ўтрымліваецца, водар, калі заварваць, неверагодны. І венікі, і травы нашы на ўра ідуць у Маскве, нават пастаянныя кліенты ёсць. Зараз у планах адкрыць аграсядзібу. Знаёмыя круцяць пальцам каля скроні: навошта грошы ўкладваеце ў бесперспектыўную вёску. Але мы не лічым яе бесперспектыўнай».

## Жыхары для Горні

А каб жылося весялей, пара размясціла абвестку на беларускіх і расійскіх сайтах: шукаем добрых суседзяў для пражывання ў беларускай вёсцы. І што вы думаеце, знайшліся ахвотныя. Нават ужо два дамы купілі.

— Тэлефанавалі з Падмаскоўя, Масквы, Прыбалтыкі, нават з Амерыкі. Людзі гатовы ехаць у вёску, але ім патрэбна работа, — расказвае Алена. — Аднойчы патэлефанавала дзяўчына з Краснадарскага краю. Ад нас да яе дома 1500 кіламетраў. Яна нават прыязджала да нас сёлета са сваім хлопцам — зусім яшчэ маладыя, гадоў па 25. Мы ездзілі іх сустракаць ва Унечу — гэты расійскі горад не так далёка ад нас. Мы ж абяцалі, што ўсім, хто хоча да нас прыехаць, дапаможам, раскажам, пакажам. Ім усё спадабалася, ад нашага лесу яны наогул былі ў захапленні — на іх радзіме такога няма. Дзяўчына фота займаецца, здымкаў нарабіла безліч. Я ёй сказала: калі пераедзеце, дапамагу знайсці работу адпаведную. Будзе на вяселлях здымаць, іншых мерапрыемствах. Гэта ў вялікіх гарадах канкурэнцыя, а ў нас нікім не прыватызаваны бізнес. Яны, дарэчы, купілі дом і абяцалі пераехаць, як толькі са сваімі справамі разбяруцца.

Яшчэ адзін дом у Горні купіў артыст з Мінска. «Калі ён напісаў, я ўсё думала, адкуль я ведаю яго прозвішча. Потым залезла ў інтэрнэт і зразумела — артыст, — усміхаецца Алена. У Хоцімску летась фільм «Чарнобыль» здымалі, і ён таксама быў там задзейнічаны. Яго зачапіла тое, што мы абяцалі дапамогу. Маўляў, зараз усе зацікаўлены толькі прадаць. Калі прыехаў да нас, адразу ж пажадаў застацца. Мы яго звазілі нават на мяжу, паказалі, дзе Расія пачынаецца. Спачатку ў Горні ён нічога сабе не выбраў, завезлі ў Батаева — гэта вёска не далёка ад нас. Паказалі яму дом, дзе за агародам адразу ж возера. І яму ён прыглянуўся. А праз некаторы час мужчына перазваніў і сказаў, што хоча два дамы купіць — і ў Батаеве, і ў Горні. Яго маці таксама пажадала перасяліцца. Падшукалі яму ў Горні будынак, ён ужо і дакументы на яго аформіў. Цяпер вось спрабуе ўзяць паболей зямлі. Аказалася, што гэта не вельмі проста: складанасці з афармленнем. Крыўдна, што працэс тармозіцца з-за нейкіх там юрыдычных нюансаў.

— Для людзей, якія едуць у вёскі, павінна быць і рэгістрацыя таннейшая, і прасцейшае афармленне, — лічаць сужэнцы. — Тут жа шмат дамоў без дакументаў. Вунь у нас у вёсцы пенсіянер усё жыццё жыве, але не зарэгістраваны. Ён не толькі свой дом не прадасць, але нават танным тарыфам на электраэнергію не можа скарыстацца. А пустыя дамы спрэс не зарэгістраваныя.

## Праслаўіцца добрымі справамі

Хоць, як спяваецца ў вядомай дзіцячай песні, гэта не магчыма. І Андрэй наўмысна мармыча сабе яе пад нос. Але бачу Падзячны ліст ад райвыканкама за актыўную грамадзянскую пазіцыю і разумею, што тут нешта не так. Так і ёсць, Андрэй не толькі прадпрымальнік, але яшчэ і староста і дэпутат.

— Сацыяльная нагрузка адчуваецца, — прызнаецца ён. — Прыходзіцца абкошваць, сачыць за парадкам. Дабіўся, каб зімой чысцілі дарогу да Горні. Раней прыбіралася толькі тая, што на Расію.

— Яго і дэпутатам за актыўнасць абралі, — смяецца Алена. — Шмат пытанняў задаваў. Абралі, каб сам гэтыя ж пытанні і вырашаў. Вось ён і круціцца. Вады няма — тэлефануе, лямпачка ў ліхтары перагарэла — ён зноў за тэлефон, ліхтар трэба паставіць — зноў ён жа займаецца.

Шамбы таксама дапамагаюць спартсменам, творчым калектывам, каб яны ездзілі на спаборніцтвы і конкурсы. Але крыўдна, калі людзі пачынаюць гэтым злоўжываць.

— Нам таксама грошы не проста так даюцца, — кажуць яны. — Вунь нават крэдыт узялі, каб крыху раскруціцца. Мы, вядома, не адмаўляемся дапамагаць, але здзіўляе пазіцыя іншых людзей. У краме зрабілі палічку дабра. Напрыклад, тэрмін прыдатнасці на той жа шампунь скончыўся або на насенне, мы гэты тавар бясплатна выстаўляем. Бярыце, калі трэба. Але побач скарбонка дабра стаіць, са зваротам ахвяраваць на добрыя справы. Людзі ахвяруюць, але часта зусім не тыя, хто забірае гэты тавар.

Перад тым, як завесці мяне ў Хоцімск на рэйсавы аўтобус, сужэнцы прапанавалі паглядзець іх мясцовую славутасць, што на мяжы з Расіяй. Проста ў лесе стаіць помнік — вялікі-вялікі конь з вершнікам. Гэта даніна памяці загінулым тут у 41-м кавалерыстам. Гэты конь уразіў Алену яшчэ ў дзяцінстве, калі яна прыязджала на канікулы ў вёску. Тут жа яны, зусім яшчэ зялёныя, прызначалі адно аднаму спатканні. Непадалёк ад вершніка стэла з пранікнёнымі словамі з «Рэквіема» Роберта Раждзественскага. Алена з Андрэем вельмі ганарацца гэтым месцам. А па дарозе ў Хоцімск Андрэй, мне здаецца, сфармуляваў менавіта то самае галоўнае, што іх з Аленай трымае ў Горні. «Нядаўна я пераглядзеў савецкі фільм «Вечны кліч», і мяне вельмі зачапілі словы афіцэра абвера Лахноўскага. Памятаеце: «Паступова, крок за крокам, мы вытруцім гістарычную памяць ва ўсіх людзей. А з народам, пазбаўленым такой памяці, можна рабіць што заўгодна. Народ, які перастаў ганарыцца мінулым, які забыўся пра мінулае, не будзе разумець і сучаснасці. Ён стане абыякавым да ўсяго, атупее і ў рэшце рэшт ператворыцца ў статак быдла». І гэта — праўда».

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*Хоцімскі раён.*
**Фота аўтара.**


ИНКАСС ЭКСПЕРТ

Закрытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация
**«ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»**
220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, 13 этаж,
тел. +375 (17) 359 74 88, факс +375 (17) 316 23 03
inbox.nkfo@incass-expert.by, www.incass-expert.by

**Консолидированная отчетность о деятельности банковского холдинга, в состав которого входит ЗАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ», опубликована на интернет-сайте www.bps-sberbank.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2019 года**

*в тыс. бел. руб.*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 50 991 | 65 888 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 | - |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 4 750 | 264 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 2 528 | 2 695 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 3 715 | 3 593 |
| 15 | **ИТОГО активы** | **11** | **61 986** | **72 440** |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 51 932 | 64 609 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 722 | 240 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 217 | 1 540 |
| 24 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **54 871** | **66 389** |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3 711 | 3 711 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 249 | 192 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | - | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3 155 | 2 148 |
| 31 | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **7 115** | **6 051** |
| 32 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **61 986** | **72 440** |

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках за шесть месяцев, закончившихся 30 июня 2019 год**

*в тыс. бел. руб.*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2019 | 01.07.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 87 | 53 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 170 | 3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | (83) | 50 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 516 | 418 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 818 | 530 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 698 | (112) |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (2) | (1) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 19 | 6 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 15 440 | 13 544 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 14 051 | 12 637 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 278 | 207 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 705 | 631 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | 640 | 355 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **1 065** | **276** |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | |

**Председатель Правления** **Э. Г. Гонтарь**

**Главный бухгалтер** **Е. М. Грибанова**

**Дата подписания: 04.07.2019**

ЗАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ» зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 27.11.2015 г., регистрационный номер 707. УНП 807000255.



Согласно определению экономического суда Минской области от 10.07.2019 по делу № 76-17Б/2019 ООО «Гран-Консалт» – антикризисный управляющий в производстве по делу о банкротстве ЧТУП «АгроХимЛайф» (220036, Минская область, г. Заславль, ул. Дзержинская, д. 26, комн. 33, УНП 690639028), в отношении которого открыто ликвидационное производство, сообщает о проведении собрания кредиторов по защите требований кредитора: крестьянского хозяйства «Эдафос», которое состоится 06.08.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, д. 68, оф. 801. Ознакомиться с предъявленными требованиями кредитора и возражениями, выдвинутыми управляющим, возможно до проведения собрания, в рабочие дни с 10.00 до 15.00, по адресу: г. Минск ул. К. Либкнехта, д. 68, оф. 801, предварительно уведомив об этом управляющего по телефону (017) 399-89-29.



В объявлении, опубликованном в газете «Звязда» от 24.07.2019, по продаже имущества СООО «Альфа-Калор», таблицу считать правильной в следующей редакции.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|
| Изолированное помещение с инв. № 250/D-36993 (квартира), общ. площадь 72,2 кв. м, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Вологина, 2Б-36 | 31 975,58 |
| KIA RIO, рег. знак 9180 ОР-7, 2001 г. в. | 1 125,00 |
| «Хафей Мини», рег. знак АЕ 0744-7, 2007 г. в. | 1 350,00 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Селицкого, 9, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53 | |

УНП 808000132